# Некалькі заўваг аб медыцынскай адукацыі

За гады Савецкай улады сярэдняя і вышэйшая адукацыя ў СССР дасягнула вялікіх поспехаў. Савецкая школа падрыхтавала выдатныя кадры, якія забяспечылі вырашэнне важнейшых навукова-тэхнічных праблем.

Але ў рабоце школ ёсць і сур'ёзныя недахопы. Галоўным з іх з'яўляецца адарванасць школы ад жыцця, ад практычнай дзейнасці. Агульнаадукацыйная сярэдняя школа рыхтуе маладых людзей толькі для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Значныя недахопы ёсць і ў сістэме вышэйшай адукацыі. Юнакі і дзяўчаты ў 17 год канчаюць дзесяцігодку і адразу паступаюць у інстытут. Такі спецыяліст не мае ніякага жыццёвага вопыту. У вучэбных планах вышэйшай школы мала ўвагі ўдзяляецца практычнай падрыхтоўцы спецыялістаў.

Прапановы аб перабудове школы горача падтрыманы савецкай грамадскасцю. Работнікі сярэдняй і вышэйшай школы абмяркоўваюць мерапрыемствы па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў. На расшыраным пасяджэнні вучонага савета нашага інстытута разам з выкладчыкамі і работнікамі практычнай медыцыны абмяркоўвалася пытанне аб формах і шляхах перабудовы адукацыі ў вышэйшай школе. Указвалася на істотныя недахопы цяперашняй сістэмы падрыхтоўкі ўрачоў. Выпускнікі маюць добрыя тэарэтычныя веды, але недастаткова валодаюць практычнымі навыкамі. На першых двух курсах навучанне можна праводзіць без адрыву ад вытворчасці па плану вячэрніх факультэтаў. На старэйшых курсах студэнты павінны працаваць у клініках. Таму **мэтазгодна, каб на вячэрнім аддзяленні на старэйшых курсах займаліся толькі тыя людзі, якія працуюць у якасці сярэдняга медыцынскага персаналу ў даным горадзе.**

У медыцынскія вышэйшыя навучальныя ўстановы трэба прымаць асоб, якія маюць сярэднюю медыцынскую адукацыю і двухгадовы стаж работы па спецыяльнасці. Студэнтам вячэрняга аддзялення, якія не працуюць па медыцынскай спецыяльнасці, неабходна з першых курсаў уводзіць практыку па догляду хворых.

Практычная падрыхтоўка нашых студэнтаў з году ў год паляпшаецца. У мінулым годзе была ўведзена трохтыднёвая фельчарская практыка пасля шостага семестра. Мы лічым, што яе трэба прадоўжыць да 6—7 тыдняў. Неабходна факультатыўную вытворчую практыку пасля дзесятага семестра ператварыць у абавязковую і праводзіць яе на ўрачэбных участках, гэта значыць там, дзе спецыялісты пасля сканчэння інстытута будуць працаваць.

**Неабходна перагледзець і палепшыць навучальныя планы такім чынам, каб студэнты на пятым курсе заканчвалі праходжанне ўсіх дысцыплін, а на шостым курсе працавалі як субардынатары па тэрапіі, хірургіі, акушэрству, гінекалогіі, інфекцыйных і дзіцячых хваробах.**

Аднак паляпшэнне практычнай падрыхтоўкі ні ў якім разе не павінна зніжаць тэарэтычную падрыхтоўку спецыялістаў.

Прафесарска-выкладчыцкі калектыў інстытута, горача адабраючы тэзісы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб перабудове сярэдняй і вышэйшай адукацыі, прыкладае ўсе намаганні, каб выпускаць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**І. БАГДАНОВІЧ,**
**дырэктар Віцебскага медыцынскага інстытута.**